№ 32 Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.
Адрэс рэдакціі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:
на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі— па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам

№ 32 (228). Год III. Вільня, 19 красавіка 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

18 красавіка.

Заходні тэатр.

Ворагі аддалі нам учора значную часць Фляндрскай зямлі, здабытай імі раней з вялікімі ахвярамі праз многа месяцаў. Наступаючы на адступаўшых крок за крокам ворагаў, мы ўзялі Пэлькапэль, Лянгэмарк і Зонэбэк і адкінулі ворагаў за паток Стэн. На поўені ад Блянкартсэ нашэ наступленіе спынено варожаў контратакай. На поўдні ад Ліс мы пад зашчытай сільнага агнь пасунуліся ўпярод. Бітвы апошніх дзён далі нам 2.500 палонных, некалькі гармат і шмат кулемётаў. На полі бітвы на Сомме, між Моррэ і Мондід'е—вострая артылерыйск. бітва.

БЭРЛІН. Дэпутація ад остзэйскіх правіцій будзе прынята у глаўнай кватэры. Дэпутат Ган з Рэвэля заявіў, што на пратэст расейскага ураду проці далучэньня да Нямеччыны проста ня будзе зьвернена увага. Расея перэстала быць вялікай дзяржавай.

ЛОНДОН. Ніжняя Палат. Льлёд Джорж сказаў, што у прыпадку незацьвердженьня Верхняй Палатай закона аб ваеннай павіннасьці і зьвязанага з ім закона аб аўтаноміі Ірляндзіі міністэрства выйдзе ў адстаўку, бо не зьбіраецца браць на сябе адказу за пасьледатвы гэтага.

«Генэрал Фос і іншые генэралы угледаюцца на ваеннае палажэньне с поўнай верай. Немцы, праўды, зрабілі англіцкай арміі вялізарные страты, каторые аднак раўнуючы да іх уласных страт, невялікі. Француская армія непарушэна. Амэрыканцы прыбываюць, вялікімі грамадамі. Еднасць дасць пабеду. (Бурные знакі здаволеньня»).

БЭРЛІН. Здарэньні на англіцкім фронці прымушаюць французаў свой фронт, каторы перад пачаткам наступленьня йшоў да Уазы, прадоўжыць да ваколіц Байель. Яшчэ 16 красавіка францускіе газэты дамагаліся учасьця англічан у зашчыце Парыжа. Цяпер самі французы павінны памагчы англічанам бараніць порты Ляманша.

БАЗЭЛЬ. Францускіе газэты баяцца, што толькі цяпер пачнецца агульнае нямецкае наступленьне на усенькім заходнім фронці. «Matin» і «Echo de Paris» пішуць, што, як відаць, Гіндэнбург мае на мэці поўнае зніштажэньне англіцкай арміі. Усе данясеньня наказваюць у вадзін голас аб прыбыцьці усё новых і новых нямецкіх дывізій на паўночным фронці.

ЖЭНЕВА. Ні ў адным месцы ад пачатку наступленьня англічане ня мелі гэткіх страт забітыми, як у страшэннай разьні ў Байель. Там пагіблі найлепшые часьці арміі Гэга, каторые ён называў «Жалезнай гвардзіей».

БЭРЛІН. У глаўнай камісіі Рэйхстагу статс-сэкрэтар марскога міністэрства заявіў, што нават най вялікшы пэсыміст павінен прызнаць, што палажэньне саюзьнікаў с прычыны падводнай вайны шыбка становіцца усё цяжэйшым і што нельга сумлевацца аб добрых рэзультатах падводнай вайны. У 1916 г. у Англію прывезено 763.000 тонн сталі, ў 1917 — толькі 497.000. Сёлета, бязспорна, прывоз будзе шмат меншы. Амэрыка ня можэ выратаваць саюзьнікаў ад пасьледзтв падводнай вайны.

БЭРЛІН. У камісіі Рэйхстагу дзеля спраў таргоўлі і прамышленасьці памочнік статс-сэкрэтара Гэпэрт сказаў, што так-званая пераходная гаспадарка пры пераходзі з ваеннага стану на мірны, праектаваная на тры гады, с прадоўжэньнем вайны павінна будзе трываць даўжэй.

ВЕНА. Урадовая «Wiener Zgt.» друкуе імператарскіе рэскрыпты гр. Чэрніну і бар. Бр'яну, каторыми першы звальняецца ад становішча міністра заграгічных спраў, а другі назначаецца на яго месцо. Імператар кажэ, што заграгічную палітыку гр. Чэрніна Бур'ян павінен вясьці далей.

ШТОКГОЛЬМ. Паводлуг вестак с Фінляндзіі, «чырвоны» народны комісарыат с прычыны бунту чырвонай гвардзіі быў прымушэн уцячы ў фінска-расейскае пагранічнае месцо, Тарыокі.

Вільня, 19 красавіка 1918.

У меру узросту беларускага нацыянальнага руху мы бачым, як побач с першыми ваякамі за беларускі народ — беларускімі дэмакратамі і соцыялістамі — выступаюць на арэну грамадзкага жыцьця новые палітычные і соцыяльные групы: тут мы бачым і прадстаўнікоў каталіцкага і праваслаўнага духавенства, і консэрватыўных паноў-земляўласьнікаў, і умяркаваных соцыяльна чыстых нацыяналістаў і т. д. Хаця між паадзінокімі беларускімі партыямі і групамі на грунці розьніцы соцыяльных пагляданў ідзе вайна,—аднак, гэтага німа што баяцца: гэта звычайная рэч у кожным жывым народзі, дзе ёсць ня толькі нацыянальна сьведомые селяне і работнікі, але і мешчанства, і паны, і духавенства.

З гэтай прычыны, паскольку чысьленасць беларускіх партыйных груп не выступае з нейкіх чыста асабістых комбінацый тых або іншых дзеячаў, яна не павінна нас пужаць: усе яны—кожная ў сваім кругу—робяць работу *беларускую* і, ідучы асобне, кіруюць да *адней нацыянальнае мэты.*

Аднак, ёсць моманты ў жыцьці народаў, калі справа палітычнае праграмы выступае на першае мейсцо, пакідаючы на другім пляне усе соцыяльные пытаньні: бо толькі палітычная свабода і незалежнасць дае народу магчымасць завясьці у сябе грамадзкі лад, які адпаведае укладу клясовых і становых сіл у тым народзі. Гэткі момэнт перэжывае цяпер народ Беларускі.

На чародзі стаіць справа *будаваньня Беларускае незалежнае дзяржавы.* Толькі пры поўнай незалежнасьці і соцыяльные патрэбы Беларускага народу будуць здаволены не так, як гэта мо' і добра для яго дужэйшых суседзяў, але так, як трэба беларусам. І ў гэты момэнт усе беларускіе партыі і грамадзкіе групы, *ня* гледзячы на розьніцу іх соцыяльных праграм, павінны злучыць свае сілы, каб збудаваць перш за ўсё *свой уласны дом*—незалежную Беларусь, а пасьля, вядома, кожная з іх будзе старацца завясьці ў гэтым доме такі лад, які адпаведае яе паглядам.

Тут, у межах старой окупацыі Беларусі, беларускае грамадзянства выявіло поўную палітычную дасьпеласць і дайшло тэй еднасьці, якой вымагалі палітычные здарэньня. На Беларускай Конфэрэнціі у Вільні 25—26—27 студня 1918 году зыйшліся прадстаўнікі усіх слаёў Беларускага народу: работнікі, селяне, мешчане, дробная шляхта і вялікіе паны, прадстаўнікі духавенства абедзьвых вер, прадстаўнікі вольных прафэсій і т. д. Партыйные кірункі: ад соцыял-дэмакратаў да консэрватараў — былі прадстаўлены усе. І усе яны так сама прадстаўлены ў выбранай на Конфэрэнціі Беларускай Радзе, каторая вядзе солідарную, згодлівую палітычную работу, якой вымагае ад яе Бацькаўшчына.

С прычыны таго, што глаўным цэнтрам палітычнага жыцьця Беларусі стаўся Менск, што там цяпер ідзе найбольш інтэнсыўная творчая гасударственая работа над будовай незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны і найбольш вострая барацьба с чужацкімі элементамі, якіе цягнуць наш край у маскоўскую, або польскую няволю, — мы з асаблівай увагай угледаемся на тое, што робіцца у менскіх беларусаў. І перш за ўсё ў нас узнімаецца пытаньне: як тамака нашы браты ацэніваюць палітычны момэнт?

Ня гледзячы на тое, што дагэтуль у Менску былі два беларускіе цэнтры: адзін — больш радыкальны—ў Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі і другі—ў Менскім Беларускім Прадстаўніцтве, сабраўшым больш умяркаваные элементы,—цяпер і тут выяўляецца работа над злучэньнем усіх творчых беларускіх сіл на грунце будаваньня незалежнай Беларускай дзяржавы. Побач с прыватнымі весткамі, якіе да нас дайшлі, аб гэтым сьведчаць і галасы беларускае прэссы. Так, у № 18 штодзеннай беларускай газэты „Беларускі Шлях" (с 13 красавіка 1918 г.) мы чытаем у рэдакцыйнай стацьці, між іншым, гэткіе словы:

„Беларусь павінна сабраць і з'арганізаваць перш у стройную сыстэму нацыянальна-дзяржаўнай еднасьці усе сьвядомые і творчые сілы. Мы знаходзімся яшчэ у працэсе зьбіраньня... Стварыўшы нацыянальную еднасць за перыод вайны, мы павінны стварыць крыніцу дзяржаўнай беларускай уласьці па прызнаку нацыянальна-творчаму, а не соцыяльнаму. Толькі пры выбарах у сойм у нас магчыма барацьба за ўласць, каб зрабіць тые ці другіе зямельные рэформы.. Цяперашні (гасударственны) механізм круціцца так-сяк самакатам, — ён прыстасаваны быў да Расейскай імперыі і яе палітыкі. Трэба яго сабраць, нарыхтаваць толькі для Беларусі і для яе нацыянальных інтэрэсаў і пусьціць у нормальны ход. Для гэтага прыдзецца сабраць усе лепшые творчые сілы розных беларускіх ста-

наў і нацыональных аседлых тут меншасьцей“.

Можэм толькі высказаць сваю радасць с прычыны гэтых слоў і шчырае жычэньне, каб на гэтае productivity становішчэ станулі ўсе менскіе беларускіе организацыі, забыўшыся ў гэты момэнт аб усіх сваіх партыйных спорках і звадках: усё-ж роўна, пры цяперашніх палітычных варунках ніякіх соцыяльных рэформ агульнага характэру зрабіць нельга, і іх можна будзе праводзіць у жыцьцё, як Беларусь папраўдзі будзе незалежнай дзержавай. Аднак, лічым патрэбным зрабіць тут адну увагу: пры злучэньні беларускіх сіл трэба пільна сьцерагчыся, каб да вялікай агульна-нацыональнай работы былі дапушчэны толькі тые элемэнты, каторые папраўдзі ўсей душой хочуць незалежнасьці для свайго краю, а не укрываюць пад славамі аб „самадзельнасьці“ чужацкай палітычнай ідэолёгіі: „да Масквы“, або „да Варшавы“. Гэта трэба мець асабліва на ўвазе цяпер, калі закладаюцца самые фундамэнты гасударственай будоўлі: бо абмылка, зробленая ў фундамэнці долу, суліць раней ці пазьней развал усяе будоўлі.

Пасывізм ці актывізм?

(Увагі беларуса с прычыны Берэсьцейкае умовы).

Чытаў я раз у аднэй расейскай газэці с практычаньнем напісаную стацьцю, ў абароне ідэолёгіі *правых*, дзе аўтар пачынаў свае доводы ад паказаньня ўсяго значэньня для чэлавека *правае рукі проці левае*. «Дык самая прырода вучыць нас, што правые маюць рацыю быцьця, якой не маюць левые» — цешыўся консэрватыўны публіцыст. Даючы назоў для свае стацьці *Пасывізм ці актывізм*, тэрміны дэфэрэнцыяцыі, каторая павінна бы ўрэшці выразьліва паказацца ў беларускім народзе, могбы, ідучы сьледам за гэным публіцыстам, пачаць ад паказаньня наагул вышшасьці актывізму за пасывізм. Я мог бы аперціся тут на правох самае прыроды, гаварыць аб іх пагвалчэньні пасывізмам, аб схаваным у ім пачатку сьмерці для кожнага жывога арганізму... Бо жыцьцё, гэтаж пераход чагось ад магчымасьці да дзела, ад быцьця потэнцыяльнага да быцьця актуальнага. Бо жыцьцё гэта рух. Гэта кажучы, я меў бы пэўна — болей рацыі, чымся гэны консэрватыст: бо так здатная правая рука, гэта нічога інша, як твор сыстэматычнага яе ўжываньня, значыцца рэч прыпадку. Тымчасам *дзела належыць да істоты жыцьця*, ёсць яго нэрвам, крывёй, мазгамі і сэрцэм. Творскае дзела ёсць яго урачыстым сьвятам. Калі хто, дык мужчыны павінны гэта зразумець перш на перш. —

На нестачу дзела хварэў, хварэе яшчэ беларускі народ. Пасывізм — няруханьне, безулада — ўеўся ў душу нашага народу. Ен проста ёсць яго найзвычайнейшай хваробай. Ен так глыбока ўеўся, што *беларускі* можэ быць назовам адмены найбольш крайняга пасывізму. Беларускі народ с сваім фаталістычным на сьвет паглядам, дагэтуль ішоў на выпярэдкі с турэцкім народам. Невядомы шырэй гэны конкурэнт, аднак быў заўсёды вялікай небаспечнасьцю для сусьветнае рэномы туркаў, як бытцым найвялікшых фаталістаў. Гэтаму запраўды апошні дзесяток гадоў пярэчыць.

У вуснах беларуса гэткіе словы як *«чакай, пастой...»* ёсць проста выяўленьнем яго душы. «Чаго табе? Сядзі, ня лезь, маўчы. Чаго сьпешацца? Яшчэ паглядземо» — гэта найвялікшая жыцьцёвая мудрасць беларуса. Клікэньні пакінуць гэты пасывізм спатыкалі заўсёды з яго боку або сумлевак у у форме: *А калі ен (гэта)... то тады што...?* або: *Так бацькі рабілі. Адчапіся — чаго прыстаў, як смала*?! Нават умоўлены ўжо да чагось умеў наш брат беларус, у апошнюю часіну перад дзелам, бытцым сьцябануць свайго коніка і раптам заварнуць аглоблі, кажучы: Годзе. *Вертаймася да хаты. На што блды шукаць? Вы сабе едзьце, калі ахвота.* Запраўды ці нец цекла толькі беларуская кроў у жылах Абломова, бо гэтаж расовая абломаўшчына перасаджэная на вёску.

Абмылкай ёсць вельмі часта высьняць наш пасывізм апрычоннымі варункамі беларускага быцьця, ўплывам прыроды краю, племенным атавізмам і т. п. Вядомая тэорыя Taine'a водле каторай варункі выробляюць чэлавека, толькі да некаторых з'яў у жыцьці народаў можэ быць пры тарнавана бо гэтае жыцьцё багацьцем і рознасьцей сваіх формаў пазбаўляе яе агульнага значэньня. Дыкжэ грашылі ў нас тым, што беларуск пасывізм *лічылі чымсь трэха неадлучным ад беларуса, чымсь прыродным, проста канечным для яго* зусім зразумелым... Там абмылка, тут віна. Варункі беларускага жыцьця зусім не даюць права беларусу быць канечна пасывістэм. Бо, — падумайма, — ні дзеля свае лічбы, ні дзеля традыцый мінуўшчыны, ні дзеля зямлі і яе прыроднага багацьця, ні дзеля пэўных сьпячых у народзе схаваных сіл ня можна апраўдаць беларускага пасывізму. Дзеля прыведзеных тут прычын мы зусім не стаём ззаду за народамі нп. Балкан, наадварот, надзеі на шчасьлівую будучыну мелі і маем шмат лепшые, чымся іншые народы.

Аднак жэ... аднак крайні пасывізм праеў наш народ наскрозь, уеўся ў косьці яго. Лішне доўга не рабілі мы належных вывадаў с чысьленасьці нашага народу, не пільнавалі, як след, нашай мінуўшчыны, і нашу спадчыну часьцю заўладалі чужынцы. Мы гэтак жаліліся на неўрадлівасць нашае зямлі і гэтулькі гаварылі аб нашых балотах, пяскох і лясох, што сьвет папраўдзі мог дайсьці крэпкай веры ў нікчэмнасць нашай ральлі, ў тое, бытцым у Беларусі *німа нічога* апрача балот, пяскоў ды першабытных лясоў. Тымчасам Беларусь — гэта абшырны край, каторы, побач з неужыткамі, мае багата ўрадлівай і прыгоднай да управы зямлі; Беларусь — гэта краіна *пекная*, павабная свей маляўнічай рознароднасьцю, бо мае горы і нізіны, лясы і зялёные пожні, рэкі і вазёры... Дый на недастачу сіл не маемо права нарэкаць: даволі успомніць, колькі чыста-беларускіх сіл працавало дзеля славы Польшчы і Масквы! *Ціж пры усім гэтым беларускі пасывізм мае аснову быту хаця бы толькі на паглядз*? Не, ніякай! Дык даволі ўжо яго. Ніхай адгэтуль ён болей ня душыць беларускага народу, які толькі будзіцца ад сну, ніхай не закрывае прад ім магчымасьці яснае будучыны.

Наша ўлюбленая прыказка: «Мая хата с краю, нічога не знаю!», каторай мы гэтак часта прыкрывалі сваю ленасць і бязчыннасць, цяжка пamсьцілася на нас. У сваім родным краю мы заўсёды лічылі сябе за нешта нікчэмнае, без-вагі, бяз голасу. *У родным краю хацелі мы аставацца у куточку*, збоку і нічога ня ведалі аб тым, што тварылося навакол, — *мы гаспадары краю*! І сталося тое, што зусім натуральна павінно было стацца: чужакі, хто толькі хацеў, пачалі гаспадарыць у нас і панаваць над намі. *«Скачы, уражэ, як пан кажэ*!» Гэтые словы, бытцым вострые ўдары бізуна, павінны бы балюча ўражаць нашу нацыональную амбіцыю, калі мы *яшчэ* маемо яе...

Цяперака будзяцца да самабытнага жыцьця флямандцы, албанцы, розные татарскіе і кітайскіе плямёны, не кажучы ўжо аб нашых суседзях літвінох і украінцах; няўжо-ж і мы гэтым разам ня збудзімся і не станем побач з гэтымі народамі? Няўжо-ж звон гісторыі ня збудзіць у нас вотліку? Няўжо-ж павінны мы толькі ўсьцяж ждаць і ждаць, азірацца і выглядаць чагосьці ці кагосьці? Ніхто нас не замяніць у рабоці дзеля збудаваньня незалежнага быту: гэта—*асабістая работа кожнага*. Няўжо-ж мы выяв м нягодны страх перад тэй рызыкай, без якой ня можэ быць ніякага адважнага дзела? Запраўды, *не варт лепшага жыцьця той, хто не адважыцца пайсьці на гэткую пачэсную рызыку*, нэрв праўдзівага жыцьця. Толькі зусім дрэнные людзі могуць бязчынна выжыдаць момэнту, калі трэба будзе толькі выцягнуць руку дзеля атрыманьня гатовай карысьці.

Вось чаму актывізм—гэта наша найважнейшая задача на сягоньня і на заўтра. Наш актывізм — гэта праца дзеля аднае мэты: дзеля правядзеньня ў жыцьцё нацыональнага ідэалу—*незалежнасьці Беларусі*. Цяпер наш саюзьнік—кожын, хто можэ і хочэ паддзержаць гэту справу. Ніякіе вымогі учуцьця ў гэткі крытычны для нас момэнт ня могуць адцягнуць нас ад таго, чаго трэбуе розум і добрае зразуменьне палітычнае карысьці. Берэсьцейскі трактат павінен даволі ярка паказаць нам пагубельные насьледкі для народу нашага пасывізму.

Вось-жэ: *актывізм хай будзе клічэм нашым на сягоньняшні дзень*!

Б. Г.

Яшчэ аб тым жэ.

Яшчэ так нідаўна «Dziennik Wileński» з незвычайным размахам граміў большэвізм і ўсю сучасную маскоўшчыну. Гэта было пад той час, калі большэвікі нішчылі польскіх паноў, палілі іх двары, забіралі дабро,—адным словам, калі ад большэвізму цярпелі *палякі*.

Зусім іншай меркай мераець тая-ж газэта большэвікоў і блізкіе да іх элемэнты, калі ад маскоўшчыны пакутуюць *беларусы*, — тые беларусы, каторым палякі у

Максім Гарэцкі.

АНТОН

(Абразы жыцьця).

(Гл. «Гоман» № 30).

XII.

— Спешна табе!
Прывітаньне ткальлі,
калі яна за кроснамі
Дурны пасьпех — людзём
на сьмех.

Прыказь.

На па стэці нечага стаяці.
таксама **Прыказка.**

Пасеяла зара ключы
Каля пастаці ідучы.

З песьні.

— Папаў пальцам у неба...
— Папаў не папаў, а у
неба пападаў...

Пагаворкі.

— Не тлумач другім таго,
чаго сам добра не разумееш...
— Дык ніхай мне тлумачуць...

—

—Гутарка,—срэбра, а моўчкі — злота!
— А што с таго злота,
што ў гарах ляжыць, нікому
карысьці не даець?

—

У брыльках і розных шапках, элеганцкі стукаючы кіёчкам, ідуць і йдуць па асфальтнаму тратуару і іншы касавурыцца у бок, як бягуць адзіноткамі і пад прашку са сваім у мяхох у шапачках, з мухтамі, прыгожые ды й ой! Якіе прыгожые, ато й саўсім такіе сабе, і ў дарагіх — уух! пальто і ў памятых пальто, старэнькіх, а электрыцкі свет заліў мёртва вясёлым мігаценьнем вокны і вуліцу, а коні звозьнікаў ляскаюць, а звозьнікі лаюцца, а самакаты гудзяць і бягуць на людзей, але зьвіляюць... Вуліца грыміць і звоніць. Стрэлка гадзінніка на вуглу вуліцы падбіраіцца пад паўнач. А прыкра-ненармальнае для прышэльца жыцьцё кіпіць; зірнуць тут на неба — яно нейкае чорнае, а зоры не зьяюць.

Ідуць, ідуць, іцуць... Чэлавек у чырвоным, абшыты залатымі гузамі і шнуркамі, с паглядам маючага крадзеную душу атчыняіць і зачыняіць шкляные дзьверы пад белымі буйнымі літэрамі „Славянская кафейная“ Блазя. Ідуць... А ў сярэдзіні нясецца з-заду музыка і за столікамі людзей, людзей, безталач, гам, шум, і усё музыка стройнапрыгожа сквярэцца сярод яго, бегаюць у ва ўсім белым с праборамі на аблізанай галаве чэлавекі, носюць...—Што закажэця: Кофе, чай, вада, піроўные, цукеркі, шоколад? — Тэ, тэ, тэ... Э? Нэ, нэ, нэ... Та-о у... Газэты... Палітыка... Нуда...

За столікам навідне:

АДНА. (нарумянена, бровы падсмурыжэны чорным, губы намазаны чырвоным, скасіла вузкіе вочкі на ахфіцэра і гаворыць да другой даволі голасна) **У мяне сяньні вечар сцёрся... Ха-ха, сьцё-ёрся... У тэатр позна, знаёмых не спаткала. А жадалосяб... ведаіш чаго?**

ДРУГАЯ. (Такая самая) О-хэ-хэ, ці мала чаю бажаюць маладые дзяўчынкі? Адзіноткі... як мы. А каго залежыць? А? Так... так, так.. А ў тых, ад каго залежаць — камні за мест сэрдэнька, мне здаецца... (кідаіць вочкам многазначна на ахвіцэраў).

Ахвіцэрскі столік:

ВУСАТЫ. (да таварыша, бразгаючы ботамі) Трохрублёвыя...

МАЛАДЗЕЙШЫ. (часам ня ведае, куды схаваць вочы, рукі і шаблю; грудзі выпінаіць) Кепства... Дрэнь... І ўсё дрэнь.. Нічога асаблівага...

ВУСАТЫ. Псіхалогіі шукаіш, чыжык? „Плюнь, —пойдзім купацца“ сказаў Чэха ў: Лаві мамент!— лепшая „псіхалогоія“ і філасофія.

ЛЫСЫ. Патрывайце, маладзічок, ня ўгледзіце як вялікага псіхолага пера робім на прававерпага армейца...

МЯЖДЖЭРЫСТЫ. Ато, ведаеце паедзім цяпер, а? Што?

СУХАШЧАВЫ. Ці варта? Цела німа... хаця тая, што... формы, формы — вот у чом усё...

ВУСАТЫ. (ціха) А грошы маіце стольکі, як смаку?

МАЛАДЗЕЙШЫ. Надакучыло... (кідаіць вокам у той-бок, круціць газэту і гаворыць, каб гаварыць). Кепства... А на палітычным небасхілі... у палітычным паветрыку сьвяжэй запахло... Немцаў... прыдзіцца... падраць за вуха... за культунае вуха... Заносяцца... немчурышкі... і дрэнь... ўсё дрэнь... нудна, маё вы хрысталюбівае...

(Далей будзе).

змове з маскалямі судзілі сьмерць і зьнішчэньне. Змова гэта, зробленая многа гадоў таму назад — у часе ўсеславянскага з'езду у Празе, не утраціла сілу і цяпер: проці незалежнасьці Беларусі выступаюць згодным хорам віленскіе палякі і маскалі. Выступленьні маскоўскіх газэт, выдаваных у Менску, проці Беларускай незалежнай дзержавы віленская польская газэта зараз жэ падхопліваe і перадрукоўвае, тлумачучы сваім чытачом, што робіць гэта дзеля «выясьненьня» справы.

Добрае выясьненьне! Варта 'бы запытацца паноў рэдактароў «Dz. Wil.», чы яны так сама высока цэняць пагляды маскоўскіх нацыоналістаў і цэнтралістаў с соцыялістычнымі наклейкамі, калі тые выступаюць проці незалежнасьці Польшчы?

Але гэта — менш важна: што Польшча заўсёды была і будзе ворагам беларускага народу і незалежнасьці яго краю—гэта ўсім добра вядома, і дзіва німа, што палякі карыстаюць з найбруднейшых спосабаў, каб толькі спыніць беларускі рух да вызваленьня. Затое лічым патрэбным адзначыць тут зусім новы момэнт: палякі ў барацьбе проці беларусаў і іх незалежнасьці *іграюць у дудку бальшэвікоў*. Прынімаючы пад увагу, што болэшэвізм—гэта найвялікшы вораг палякоў, гэткі ненатуральны саюз бітых большэвікамі палякоў с тымі, хто іх б'ець, можэ быць вытлумачан толькі тым, што на гэткі крок папхнуло палякоў безнадзейнае палажэньне: яны пераканаліся, што Польшча панаваць над намі ня будзе, бо на гэта не пазволіць уся Еўропа,—і вось яны цалуюць у бот большэвікам, спадзяючыся ад іх вытаргаваць мо хоць кусочэк Беларускай зямлі!

Г. Б.

Польскі урад і Беларусы.

«Беларускі Шлях» у № 5 піша:

„У аднэй с тутэйшых газэт чорным па беламу надруковано, што на прапазыцыю, зробленую ад Менскага пачтова - тэлеграфнага начальства польскаму прэдстаўніцтву, каб вярнуць толькі частку (?) сумы (а не малая-ж сума: $8^1/_2$ мільёнаў грашмі і 14 мільёнаў працэнт. папераміl), узятай польскімі легіёнэрамі с почты пасьля уцёку бальшэвікоў, начальнік пачтова-тэлеграфнага округу атрымаў ад польскага прэдстаўніцтва такі адказ:

«Прэтэнсіі начальніка округу прыняты пад увагу і будуць разгледжаны Польскім Урадам пры рэгуліраваньню ўзаемных стасункаў Урадаў Польскага і Рускага».

Якое адносіньне Польскі Урад мае да Менскіх грошы?

Хто калі мог падумаць, што грошы с почты у Менску павінны папасьць у скарбонку да Варшаўскага ураду?

Адказ палякоў—вельмі характэрны: ён паказвае, што польскі урад праз галавы беларусаў хочэ завязаць зносіны з маскоўскім урадам у імя аслаўленага польскага кліча: «niema Rusi, jest tylko Polska i Moskwa». І ў імя таго-ж кліча ён рабуе урадовые установы Беларусі.

Тут гожэ аднаначыць факт, што далёкі і чужы нам румынскі урад зьберэгае для беларусаў іх нацыональнае меньне ў Яссах, румынскім месьці. А „браты" палякі ў беларускім месьці займаюцца тым, чым займаліся перад імі большэвікі... Ці ня ёсць гэта знак польска-маскоўскай духоўнай бліскасьці,—ці мо палякі так шыбка пераймаюць большэвіцкіе навукі?

Менскі Вучыцельскі Інстытут.

«Беларускі Шлях» у № 9 піша:

„Вучыцельскі інстытут атчынены быў у Менску 1-го ліпня 1914 г. С прычын ваеннага часу інстытут гэты ў кастрычніку 1915 г. перавялі ў Яраслаўль; туды ж пераехалі тады і ўсе вучні інстытуту і дзеля гэтага навука у інстытуці, не зважаючы на эвакуацыю, не спынялася.

У цяперашнім часе навука ідзе у вз ўсіх трох класах. Апрача гэтага, летась пры інстытуці істнавалі аднагодніе пэдагагічные курсы для пацгатоўкі вучыцелёў для вышэйшых пачатковых школ. На гэтых, курсах летась было 80 чалавек. Такіеж курсы вядуцца і сёлета, хоць запісаўшыхся на іх цяпер менш.

Дзякуючы акуратнасьці і эканомнаму расходу грошай, якіе выдаваліся на утрыманьне інстытуту, а так сама дзякуючы падмогам ад Менскай Месцовай Земскай Управы (3000 р.) і ад міністарства народнай прасьветы, інстытут — за чатыры гады свайго істнаваньня патраціў на свае ашчаднасьці закупіць дамовую абстанову, нажыць добрую бібліотэку і наладзіць для патрэб інстытуту фізычны і хімічны габінэты.

На моцы пастановы Часовага Ураду 14 ліпня 1917 г. вучыцельскіе інстытуты рэформаваны, праграма навуковая шмат павялічана.

Дырэктарам інстытуту ад пачатку яго істнаваньня назначаны быў вядомы падагог сярод вучыцелёў нашага краю — Дзьмітры Сяпура. Як толькі былі ўведзены выбары на дырэктарау ў сярэдніх вучылішчах, пэдагагічная корпарацыя інстытуту — у адзін голас выбрала таго самога Д. Сяпуру, як незамяняімага вучыцеля пэдагогікі і філёсофіі і самага практычнага адміністратараік і раўніка ўсяго жыцьця інстытуту. І цяпер уся вучыцельская корпарацыя разам с сваім дырэктарам жыве як адна дружная сем'я, аддаючы ўсе свае сілы вялікай сьвятой справе.

У Яраслаўлю інстытут прабыў ужо тры гады; далей заставацца яму там німа ніякай патрэбы, бо гэтае места мае свой вучыцельскі інстытут; гэткім парадкам менскаму інстытуту хутка прыходзіцца зрабіць якую-колечы пастанову: або нарочацца у свой родны край — у Менск, або пэрэбірацца ў якое другое расейскае места, куды яго,разумеецца, вельмі ахвотна прымуць а нат ужо цяпер стараюцца перацігнуць.

Д. Сяпура зьвертаўся да некаторых грамадзкіх арганізацый у справе звароту вучыцельскага інстытуту у Менск але нідзе нічога не дабіўся.

Чым жэ заняты галавы нашых цяперашніх заправіл і хто яны такіе, калі такая справа, як вучыцельскі інстытут на Беларусі — так мала іх цікавіць?

Трэба спадзевацца, што знойдзецца такая беларуская арганізацыя, каторая не прасьпіць так важнай справы для сябе і не аткладаючы займецца шчыра, каб Менскі Вучыцельскі Інстытут вярнуць у Менск.

Немцы на навуку, на прасьвету глядзяць вельмі павэжна і пэўна, што ў гэтэй справе ад іх можна спадзевацца не перашкоды, а помачы і прыхільнасьці".

Каб прыгатаваць вучыцелёў прынамсі для першых кляс сярэдніх школ, патрэбен вучыцельскі інстытут.

Менскі Вучыцельскі Інстытут, як с паміж прафэсараў так і студэнтаў мае шмат беларускіх сіл. З людзьмі гэнага інстытуту яшчэ нядаўна працаваў разам наш паэта і грамадзянскі дзеяч М. Багдановіч. Беларускі характэр Менскага інстытуту павінен павялічыць нашае жаданьне вярнуць яго на старае месца ў Менск, цэнтр Беларусі. Разам з гэтым ён павінен быць зусім абеларушчаны. Прафэсары не сьвядомые беларусы павінны быць заменены сьвядомымі беларусамі. Тут патрэбны быліб такіе людзі, як Эпімах-Шыпіло, Кахановіч, Масоніус і інш.

Наагул трэба свае інстытуцыі беларусам браць у саве рукі. Справа-ж інстытуту гэта справа вельмі гарачая і з ёй трэба сьпяшацца, бо апрача ўсяго іншага інстытут можэ дастацца чужнікам. Нехай беларусы ў Менску акта займуцца гэтай справай.

Скрыпты шовіністы.

...,Пані Коллонтай вышла у адстаўку, пакінуўшы пост камісара апекі..." «Кажуць, што гэта звязаецца у звязку з арэштам яе мужа, бышага камісара Дыбенко».

„Ульянова назначаецца замясьціцелем камісара прасьветы ў Маскоўскім округу". «Кандыдаткай на пост, займаны п. Коллонтай, ёсць жонка Леніна».

Калі да гэтых сьвежых газэтных вестак дадаць яшчэ, што жонка «глаўковерха — Крыленко — п. Крыленчыха была главковыдаўцом вябошчыцы „Акопнай Праўды", у якую спрытна закопвала сотні тысяч „керэнскіх і царскіх", то прыходзіцц да высноўку, што бальшэвіцкая ўлада з натуры сваей мае матрымоніяльны характэр. Усё пары: Крыленко — Крыленчыха, Ульянаў — Уляничыха, Дыбенко — Дыбенчыха —Коллонтай...

Яно выгадней праўда, але для каго?..

* * *

„Абласны камітэт партыі с.-р., не раздзеляючы палітыкі беларускіх арганізацыяў у пытаньні аб незалежнасьці Беларусі, адзываў сваіх прэдстаўнікоў... п.п. Мокрэева, Злобіна і Белкінда"... Так сама з газэтаў — менскіх.

Цікаўна ведаць, дзе знаходзіцца гэты „областной комітэт". Бальшэвікі так сама ня згодные с палітыкай беларусаў, зрабілі свой „комітэт северо-западной области" у Смаленску, аткуль „областью" мае правіць „таварыш" Вашкевіч. А «область» «т. т.» Мокрэева, Злобіна і Белкінда — дзе яна? Калі ўсё яшчэ ў Менску, дык вялікая шкода, што ее не адзваў адзэтуль цэнтральны камітэт куды-небудзь у Маскву, Пэтраград, Разань...

Там для «области» будзе шырокае поле для працы... — уся разваліваючаяся Расея — а тут... Беларусь будуецца!—«Стесніцельно!»

Тым болей, што ўлоньне усіх гэтых обласьцеў — земсаюз — ліквідуецца.

А. Навадворскі.

(«Беларускі Шлях»).

Ты, Вільня, мяне узгадавала...

Ты, Вільня, мяне узгадавала,
Тут сьніў я дзіцячые сны!..
Нераз была мачыхай Ты, —
Душы маей боль задавала,
З-за вугла камені кідала
З незнанай і братняй рукі,
І чару ад вусн адбірала,
Хаця я ўміраў ад смагі,
І ў чару ту горач ўлівала,
І піць мне яе падавала, — —
Хоць мачыхай мне была Ты,
У сэрцы маім шмат любві...

Люблю за тваю Цябе долю,
Што сумная страшна была...
Ты прожыла шмат многа болю,
Так сама нешчасна, як я...
Нераз груганоў чорны хвалі
Ты бачыла, Вільня мая,
Як лапаталіся ў далі
Ажно дрыгатала душа...
Ты, бедная родная маці,
У сэрцы тваім боль-туга...
Уцеху калі нам спазнаці?
Калі згіне горэ-беда?..
За ўсе твае мукі нядолі
Люблю Цябе я яшчэ болей...

За радасьць вясенных усьмехаў,
Як сонейка блісьне з-за хмар, —
Мінуўшчыны прожытых рэхаў,
Што думы нам веюць на твар,—
За долю-нядолю твою,
За коратку ўцеху вясны, —
Хоць мачыхай мне была Ты, —
Цабе, мая, Вільня люблю!..

Я. М.

У Вільні і ваколіцах.

× **Папраўка.** У статьці „**Правапіс і Граматыка**" № 31 „Гомана" не дагледжэны гэткіе карэктарскіе абмылкі: на трэцяй страніцы, 1 ай грaнцы надруковано: „некаторые кажуць, што ў беларускай мове і так *о* заўсёды кажыца, як о", а трэба ...*о* заўсёды кажыцца, як *а*. На 3 страніцы, 2-й грaнцы, 36-й радок зверху надруковано: „часам, а трэба: *с* часам. У № „Гомана" друкаваным лацінскімі літэрамі гэтых абмылак нема.

× **Беларускі тэатр.** У нядзелю, 28 красавіка, на сцэне Беларускага Клюбу будзе прэдстаўлены драматычны абразок у 1 акце с пеяньнем п. н. „У зімовы вачар".

П'еса гэта была ўжо іграна ў мінулым сэзоне і мела вялікую ўдачу. Глаўную роль іграе рэжысэр драматычнае дружыны п. Олехновіч.

Поўны настраеньня і драматычных момэнтаў паменёны сцэнічны абразок робіць сільнае ўражэньне і ад першай да апошняй з'явы прыковывае ўвагу публікі.

Пачатак а 7-й гадз. веч.

× **С Т-ва „Золак".** Урад Т-ва „Золак" просіць надрукаваць:

У дзень Сьв. Юра, патрона Т-ва „Золак" 23 красавіка (у аўторак) у праф'яльным касьцеле Сьв. Яна, а 9-й гадзіне ранішай **адбудзецца** імша за памысьнае развіцьце Т-ва. Урад запрашае усіх членаў і спрыяючых асоб прыбыць на імшу.

Ад кс. Уладыслава Толочкі, спавядаўшага дзяцей с прытулку Т-ва „Золак", урад атрымаў ліст, у каторым між іншымі кс. Толочка просіць падзякаваць адміністрацыі прытулку за добрае прыгатаваньне дзяцей да вялікоднай сповeдзі.

Урад Т-ва „Золак" ад сябе і дзяцей складае сардэчную падзяку доктару Юльюшу Сумороку за дармовую лекарскую помач, якую ён даваў у часе гэтай зімы у прытулку, у каторым за гэты час, ня гледзячы на цяжкіе варункі, не было ані аднаго выпадку эпідэмічнай хваробы сярод дзяцей.

Сэкрэтар Т-ва „Золак"

Станіслава с Кісялёў Корфф.

× **З Літоўскай Тарыбы.** Юрыдычная Камісія Літоўскай Тарыбы просіць грамадзян Літвы, катарые маюць патрэбны навуковы цэнз або калі-колечы працавалі, як суддзі, пракуроры, прысяжные адвакаты, нотарыусы, прыватные адвакаты, сэкрэтары, пісцы і т. д., і цяпер хацелі бы працаваць у літоўскіх дзержаўных судох,—каб зьверталіся да юрыдычнай камісіі пры Літоўскай Тарыбе, падаваючы ведамасьці аб сваім веку, навуковым цэнзе, калі, ў якой установе і якое становішчэ занімалі, якіе знаюць языкі (—гутарку і на пісьме), чы маюць сям'ю, ці адзінокіе.

Ад імі юрыдычнай камісіі

Енас Вілейшыс.

× **Пачтовые скрынкі.** На нямецкай почці ў Вільні, Вялікая вуліца 21, ад 1 мая аддаюцца ў арэнду пачтовые скрынкі с ключом. Падробнасьці можна давядацца ў канцэлярыі почты ад 11 да 1 гадз. ранішай.

× **Апавешчэньня.** Stadthauptman апавешчае, што 22 красавіка ў 10 гадз. наранiцы ў Ратушы, Домініканская 3, ў бытай кватэры касы будзе продаж з аукціона рэчаў, арэштаваных за незаплату падаткаў. Гаспадаром гэных рэчаў асобна наказываць ня будуць.

Stadthauptman апавешчае, што вывазіць і падвозіць да вагзалаў грузы могуць толькі асобы, што дасталі на гэта пазваленьне ад мястовага ўпраўленьня. Прыватные асобы, што патрабуюць пасланць грузы могуць карыстаць працай гэтых асоб.

Stadthauptman апавешчае, што 1-га і 2-га мая у аўкцыоннай салі мястовага лёмбарду Троцкая 14 ад 10—2 гадз. будзе продаж з малатка прасрочэных закладаў прыватнага лёмбарда Канторовіча.

Stadthauptman апавешчае, што першая рата падатку на нерухомасьці і даходы з іх, промыславага падатку і сабачага, 1-я і 2-я рата галоўнага на 1918 год і ўсе недаімкі 1916 і 17 г. павінны быць заплачэны найпазьней 10-га мая ў касе мястовага павету, Домініканская 3, пакой 3.

× **Неасьцярожная езда.** На прахадзіўшага праз вуліцу нейкага Абрама Голомба наехаў воз, вельмі яго абязвечыўшы. Г. ў карэтцы скорай помачы адвезьлі ў Жыдоўскую бальніцу.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
15 — 16	+ 17,5°	+ 6,0°
16 — 17	+ 19,1°	+ 1,8°
17 — 18	+ 19,5°	+ 4,2°

З усяго Краю.

Беларускае войска на Румынскім фронці.

У Менск прыехалі беларускіе прэдстаўнікі з Румынскага фронту: камісар Манцэвіч і загадчык вайскавой часьцю камісар'яту генэр. штабу падпалкоўнік Біттэнбіндэр.

На румынскім фронці беларусы мелі: армейскі корпус, дзьве апалчэнскіе дружыны (Магілёўская і Вітэбская), Беларускі кавалерыйскі нацыянальны гусарскі полк, артылерыйскую брыгаду і шмат тэхнічных часьцей.

С прычыны міру Румыніі з Нямеччынай — усе беларускіе вайсковые часьці, як гэта патрэбавала Нямеччына былі дэмобілізованы, салдаты распушчэны, а дастатак і аружжэ — здадзено на схоў у армейскіе склады.

Беларуская газэта ў Слуцку Менск. губ.

У Слуцку с 3 сакавіка (марца) пачала выходзіць штодзенная беларуская газэта «Родны Край». Выдае газэту Слуцкі Беларускі Нацыональны Камітэт. «Родны Край» шырока расходзіцца ў месьці і вёсках. Газэці і Беларускаму Камітэту з усіх сіл старающца шкодзіць палякі, ужываючы дзеля гэтага розных нягодных спосабаў, абмаўляючы перад нямецкімі ўласьцямі.

Беларускі прытулак.

Беларускае Народнае Прэдстаўніцтва ў Менску 28 сакавіка (марца) прыняло пад свой загад прытулак імі сёстраў быўшага земскага саюзу на Захараўскай вул. № 13.

У прытулку ёсць 36 дзяцей ад 5-14 год. Усе беларусы.

(«Беларускі Шлях»).

Хлеб у Менску прадаецца па 1 р. 70 к. фунт. За гэткую цану хлеба можна даволі дастаць. З 20 красавіка хлеб будзе выдавацца толькі па бонах.

Аб літоўскай Радзе.

Камісія дзержаўных і адміністрацыйных спраў нямецка-літоўскага таварыства мела 11-га красавіка заседаньне, на каторым разглядалі прычыны, каторые перашкаджаюць практычнай працы, каторую манілося робіць т-ва. Было падчыркнено, што перашкодай з аднаго боку было тое, што Літва ўсё яшчэ ёсць этапнай тэрыторыей, з другога боку, што працаваць с Краёвай Радай у яе цяперашнім складзе немагчыма. У ёй радыкальные элементы захапілі кіраўніцтва. Ад іх чакаем н гатыўных адносін да спроб нямецкага супрацоўніцтва. Дзеля гэтага быые на заседаньні лічылі канечна патрэбным як утвараньня краёвага ўраду, так і аднаўленьня літоўскага народнага прэдстаўніцтва, каторае павінно бы адпаведаць шчыра-рэлігійнаму і зусім не рэвалюцыйнаму літоўскаму народу.

У Балтыцкіх землях.

Нямецкі імператар прыслаў прэзыдыуму злучэнай Краёвай Рады Ліфляндзіі, Эстляндзыі, Рыгі і Эзэля барону Пільяр ф. Пільхау ў Рызе тэлеграму, ў каторай, між іншым, кажэцца: «Просьба Краёвай Рады аб прылучэньні да Нямеччыны пад маім скіпэтрам будзе спагадліва разгледжэна. У просьбе я бачу знакі веры да мяне, майго дому і Нямеччыны і выказываю Краёвай Радзе маю імператарскую падзяку.

У Бэрлін прыехала дэпутація злучэных краёвых рад Эстляндзіі, Ліфляндзіі, Рыгі і Эзэля, зложэная з немцаў, латышоў і эстаў. Галава дэпутацыі—маршалак эстонскай шляхты, барон Дэлінггаўзэн. Яна будзе прынята канцлерам і выскажэ яму жаданьне Балтыцкіх зямель цеснага далучэньня іх да Нямеччыны.

С Польшчы.

Паважны нямецкі палітык, галава вольных консэрватараў, барон ф. Зэдліц, пішэ ў сваей газэці, між іншым, гэтак:

„Гутаркі аб Польшчы у прускай палаці паноў шмат выясьнілі гэту справу. Перш за ўсё было устаноўлено, што перэгаворы і пастановы левага блоку з гр. Ронікерам аб граніцах Польскага Каралеўства і адносінах яго да Нямеччыны не маюць ніякай вагі, бо гэткіе перэгаворы, на пагляд канцлера, можэ весьці толькі ўрад з урадам. Ня менш важна і устанаўленьне факту, што і са зьместам гэтых пастаноў наш урад зусім не згаджаецца. Бязспорна, будзе паўторэна холмская справа. Трэба будзе лічыцца з вялікім нездавольствам палякоў цэнтральнымі дзержавамі, якіе ня могуць даць палякам жаданай імі „вялікай Польшчы", каторую палякі называюць „гісторычнай Польшчай". Сваімі пастулкалі палякі самі давялі да таго, што гутарка можэ ісьці не аб вялікай, а аб малой Польшчы".

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

БЭРЛІН. Камісар дзеля заграмічных спраў расейскага ураду заявіў нямецкаму ураду, што прыгатаўленьні дзеля прыёму нямецкага пасла ў Маскве ўжо зроблены. Для графа Мірбаха нанят ужо ў Маскве дом. Ад граніцы яго і яго сьвіту перэвязуць у Маскву экстрэным поездам.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. 14.IV. (В.Т.Б.). На Каўказкім фронце узята крэпасць Батум. Дэлегація жыхараў вітала нашае войска. Лічба палонных і здабыча яшчэ не падлічэна.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН. Нямецкі пасол ў Украіне заявіў с прычыны пратэсту Украінскага ўраду проціў прылучэньня да Румыніі Бэссарабіі, што спрэчка між Украінай і Румыніей зусім не цікавіць Нямеччыну.

ВЕНА (В.Т.Б.). 16.IV. На мейсцо графа Чэрніна назначэн вэнгерэц, Стэфан Бурыан, быўшый ужо міністрам заграмічных спраў перад гр. Чэрнінам.

БУДАПЭШТ. Міністэрства Вэкэрле пастанавіло падацца ў адстаўку. Магчыма, што кароль загадае Вэкэрле утварыць новае міністэрства.

РОТТЭРДАМ. 15.IV. Пры ўчорашніх паўторачых непарадках у Газе войска прымушэно было стрэляць. Забіто і ранено каля 50 чэл.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

16.IV. Заходні тэатр:

Наступленьні на полі бітвы ля Ліс мелі поўную ўдачу. Пасьля кароткага агню мы неспадзеваным штурмам занялі Вульвэргэм і непрыяцельскіе пазыціі з абодвых бакоў гэтага места. Англіцкіе контратакі зусім адбіты. Нашые войскі здабылі пасьля штурму вышыні між Нюв-Кэрк і Байель. Англіцкіе атакі проціў Лёкон адкінуты. На полі бітвы Сом артылерыйская бітва ў некаторых мясцох дайшла вялікшай сілы. На поўнач ад ручча Ліс мы узялі палонных.

Усход

Фінляндзія. Нашы войскі высадзіліся ў Ловізе, зламалі супраціўленьне непрыяцеля і дайшлі чыгункі у Тамэрфорс.

17.VI. Заходні тэатр:

На крывавым полі леташняй французскай баталіі армія Сыкста ф. Арнім заняла Пашэндаль і пасунулася ўпярод пры Бэзэляр і Гэлювэльт. На поўначы ад Ліс мы здабылі штурмам вёску Вітчэт і адбілі сільные контратакі. На палудзенным заходзі ад Вульвэргэм мы адкінулі ворагаў за паток Дув. Байель і ўпорна бароненые Капэлін і Мэтэрэн узяты. Англічане вялікшымі сіламі і с падмогай пасьпяшыўшых сюды французаў памыкаліся адабраць назад Мэтэрэн і Мэрый. Іх штурмы зламаліся с цяжкімі стратамі.

Наабапал Сомы—вострые артылерыйскіе бітвы, трываўшые і ў начы.

Македонскі фронт.

У даліне Струмы ў перэдавых стычках ўзяты ў палон 155 англічан і некалькі грэкаў.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ПАРЫЖ. 16 красавіка абстрэл Парыжа з дальнабойнай гарматы трываў далей. Забіты 13 асоб, ранены—45.

ГААГА. Амэрыканскіе ваенные параходы прылучыліся да англіцкага ваеннага флоту ў Паўночным (Нямецкім) моры.

ПАРЫЖ (Гавас). 17.IV. Болёпаша, засуджэны на сьмерць за зносіны з Нямеччынай, сягоньня а 6 гадз. раніцы расстрэлян.

АБВЕСТКІ.

Выдавецтва В. Ластоўскага.

Выйшлі з друку:

1. „Першая чытанка", В. Ластоўскага . . . . Мр. 0,50
2. „Смык Беларускі", Сымона Рэўкі с пад Барысава . . . . „ 0,40
3. „Загадкі", сабраў В. Ластоўскі . . . . „ 0,20
4. „Выпісы з беларускай літэратуры", часць I: Пробкі літэратурнай мовы XIII—XVIII сталецьця, Духоўные беларускіе песьні; Народная славеснасць . . . . „ 1,00
5. „Незабудка", першая, пасьля лемэнтара, чытанка . . . . „ 0,50

У скорым часе выйдзе з друку другое выданьне „Родных зернят"—кніжкі для школьнага чытаньня год II і III; „Пачаткі географіі" „Ботаніка" „Гісторыя Беларусі для пачатковых школ" В. Ластоўскага.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.